ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 15 (1008) | АЎТОРАК, 9 кастрычніка 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Першым на парадку яго дня было пытанне аб зацвярджэнні плана работы Савета універсітэта на 2001-2002 навучальны год, па якому выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С.Ф.Каморнікаў.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна вылучаны прадстаўнікі універсітэта для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне прэмій НАН Беларусі, студэнцкая навукова-даследчая фальклорная лабараторыя "Вандроўнік" кафедры беларускай літаратуры – для заахвочвання Саветам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, зацверджаны праграмы ўступных экзаменаў у аспірантуру і кандыдацкіх экзаменаў.

Разгледжана пытанне аб прадастаўленні праектаў на конкурс Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, па якому выступіў начальнік НДС В.Р.Сафонаў.

Рашэннем ВАК Беларусі прысвоена вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці "Літаратуразнаўства" І.М.Афанасьеву з кафедры рускай літаратуры, кандыдатуры двух чалавек прадстаўлены Саветам у ВАК для прысваення ім вучонага звання дацэнта.

На Савеце разгледжаны таксама іншыя пытанні універсітэцкага жыцця, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

Навуковая канферэнцыя студэнцкай моладзі

## БЕЛАРУСЬ У XXI СТАГОДДЗІ



Пад такой назвай Гомельскімі абласнымі выканаўчым камітэтам і Саветам дэпутатаў, ГДУ імя Ф.Скарыны праведзена I абласная навуковая канферэнцыя студэнцкай моладзі па грамадскіх навуках.

Адкрыў канферэнцыю прарэктар нашага універсітэта доктар фіз.-мат. навук, прафесар С.Ф.Каморнікаў, з прывітальным словам да яе ўдзельнікаў звярнуўся рэктар доктар фіз.-мат. навук, прафесар, член Савета Рэспублікі М.В.Селькін. На пленарным пасяджэнні з цікавымі і грунтоўнымі дакладамі аб будучым Беларусі ў геапалітычным аспекце, маладзёжных грамадскіх аб'яднаннях Гомельшчыны выступілі старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў к.э.н. В.С.Сяліцкі, старшыня камітэта па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама В.А. Санчук.

Затым работа канферэнцыі працягвалася ў 5 секцыях – "Эканоміка і права", "Гісторыя Беларусі", "Педагогіка і псіхалогія", "Сацыялогія і паліталогія", "Філасофія і філалогія". На іх было заслухана звыш 50 навуковых дакладаў студэнтаў і навучэнцаў ГДУ, БелДУТа, тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога, Гомельскіх дарожна-будаўнічага і машына-будаўнічага тэхнікумаў, гандлёва-эканамічнага каледжа Белкаапсаюза, музычна-педагагічнага каледжа імя Л.С.Выгоцкага, каледжа мастацтваў імя Сакалоўскага, Гомельскага медвучылішча па самых розных аспектах жыцця рэспублікі, месцы і ролі ў ім сучаснай моладзі і інш.

## ВЫНІКІ ПАДВЯЛА ДЗЯРЖКАМІСІЯ

**18 верасня 2001 года старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю А.А.Тозікам была прадстаўлена Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнку справаздача аб выніках работы дзяржаўнай камісіі па кантролю за ўступнымі экзаменамі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ў 2001 годзе і напрацаваныя камісіяй прапановы па далейшаму ўдасканаленню прыёму ў навучальныя ўстановы.**

**Вынікі работы дзяржкамісіі атрымалі станоўчую ацэнку кіраўніка дзяржавы, які адзначыў, што вырашана галоўная задача: забяспечана справядлівае і празрыстае правядзенне ўступных экзаменаў у ВНУ рэспублікі. На думку Прэзідэнта краіны, работа камісіі павінна быць працягнута і ў наступныя гады.**

Кантроль за ходам уступных экзаменаў і работай прыёмнай камісіі ажыццяўлялі ва ўсіх 43 вышэйшых і 87 са 149 сярэдніх спецыяльных дзяржаўных навучальных установах, а таксама ўпершыню – ва ўсіх 12 вышэйшых і 4 з 8 сярэдніх спецыяльных прыватных навучальных установах рэспублікі (у 2000 годзе – у 43 вышэйшых і 62 сярэдніх спецыяльных дзяржаўных навучальных установах).

Галоўная мэта дзяржкамісіі па кантролю за ходам уступных экзаменаў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы заключалася ў тым, каб устанавіць дзейсны кантроль за забеспячэннем роўных магчымасцяў для ўсіх, хто па-сапраўднаму хоча ўліцца ў шэрагі дружнага студэнцкага брацтва. А жадаючых аказалася больш як 83 тысячы чалавек. Менавіта такая колькасць заяў ад абітурыентаў была пададзена на 233 спецыяльнасці 43 дзяржаўных ВНУ. Адпаведна сярэдні конкурс па рэспубліцы склаў 3,4 чалавека на месца, што на 0,4 бала больш, чым летась.

Рост сярэдняга бала звязаны не толькі з павышэннем прэстыжу адукацыі і дэмаграфічным скачком 1983-1984 гадоў, але і з упершыню прадастаўленай абітурыентам у гэтым годзе магчымасцю паступлення ў некалькі ВНУ адначасова, якой скарысталіся 37% паступаючых.

У той жа час гэта навінка выклікала шмат пытанняў, вырашаць якія дзяржкамісіі даводзілася па ходу ўступнай кампаніі. Так, у правілах прыёму ў ВНУ не была прадугледжана магчымасць прадстаўлення ксеракопій меды-

**(Заканчэнне на 3-й стар.).**

Міжнародныя навуковыя чытанні

## ПРА СЛАВУТАГА ЗЕМЛЯКА

Рэчыцкі гарадскі выканаўчы камітэт і наш універсітэт сталі арганізатарамі правядзення Трэціх міжнародных навуковых Доўнараўскіх чытанняў. На працягу двух дзён яны праходзілі на радзіме выдатнага вучонага М.В.Доўнар-Запольскага ў горадзе над Дняпром. У іх прынялі ўдзел звыш 40 даследчыкаў багатай навуковай спадчыны нашага суайчынніка з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Ізраіля.

Уступным словам традыцыйныя чытанні адкрыў старшыня Рэчыцкага гарвыканкама М.М.Заразака. Гасцей і ўсіх прысутных цёпла павітаў прарэктар ГДУ па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін.

На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі: старшы выкладчык кафедры беларускай культуры ГДУ М.В.Лебедзева – "Аб юнацкіх гадах М.В.Доўнар-Запольскага", кандыдат гістарычных навук А.К.Цітоў (Мінск) – "Да пытання аб гербе г.Рэчыцы", доктар гістарычных навук з Кіева Ю.А.Мыцык – "З гісторыі Рэчыцы ў гады нацыянальна-вызваленчай барацьбы украінскага народа 1648-1654 г.г.".

Затым чытанні праходзілі ў дзвюх секцыях: аб жыццёвым і навуковым шляху М.В.Доўнар-Запольскага і краязнаўчай – па гісторыі рэчыцкай зямлі.

Сярод замежных навукоўцаў вялікую цікавасць выклікалі выступленні доктара гісторыі з Гданьскага універсітэта (Польшча) А.Глагоўскай і доктара гістарычных навук з Інстытута дыяспары пры Тэль-Авіўскім універсітэце (Ізраіль) Л.Л.Смілавіцкага.

У Доўнараўскіх чытаннях актыўны ўдзел прынялі навукоўцы ГДУ. Са змястоўнымі паведамленнямі на секцыях выступілі загадчыкі кафедр доктары філалагічных навук, прафесар І.Ф.Штэйнер, У.І.Коваль, дацэнты Д.Д.Паўлавец, Б.У.Сарвіраў, У.І.Качаткоў, дэкан юрыдычнага факультэта Ю.А.Ключнікаў, дэкан завочнага факультэта М.Н.Мурашка, дацэнт В.С.Новак, аспірант Д.Р.Казлоў, студэнтка 4-га курса эканамічнага факультэта Аліна Арлова, якая ўдастоена стыпендыі імя М.В.Доўнар-Запольскага, выплачваемай са сродкаў Рэчыцкага гарвыканкама.

Прайшоўшыя чытанні з'явіліся новым этапам у паглыбленым вывучэнні жыццёвага шляху і навуковай спадчыны чалавека, які ўнёс вялікі ўклад у беларускую навуку і культуру.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

Нашы юбіляры

## ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

*Чырвань і золата верасня ўпрыгожваюць наваколле, ляцяць у паветры тонкія павуцінкі. Гэта хараство асенняй прыроды напаўняе душу нейкім своеасаблівым святлом, спакоем і развагай. Менавіта ў такую цудоўную пару года нарадзіўся 80 гадоў назад Міхаіл Афанасьевіч Дзмітрыеў – Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік БССР, доктар педагагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, правадзейны член Міжнародных акадэмій акмеалагічных навук і тэхнічнай адукацыі, кавалер ордэнаў Леніна, Айчыннай вайны, Славы III ступені, шматлікіх медалёў за працоўныя і баявыя заслугі. За плячыма – вялікае жыццё, аддадзенае да канца служэнню любімай справе, людзям. І калі можна было б сабраць разам у дзень яго знамянальнага юбілею ўсіх былых выхаванцаў – вучняў, студэнтаў, а таксама калег, каму ён аддаваў цеплыню свайго шчодрага сэрца, багатыя педагагічныя веды і вопыт, не хапіла б самай вялікай аўдыторыі. Але яны не забыліся пра свайго мудрага настаўніка – на яго адрас з усіх куточкаў не толькі рэспублікі, але і былой савецкай краіны даслана шмат віншавальных тэлеграм са словамі ўдзячнасці, любві, найлепшымі пажаданнямі.*

*Амаль два дзесяцігоддзі працаваў М.А.Дзмітрыеў у нашым універсітэце на кафедры педагогікі і псіхалогіі. Пасля выхаду на заслужаны адпачынак працягвае супрацоўнічаць з калектывам, у якім паранейшаму цэняць яго веды і вопыт. Дзякуючы і яго намаганням ва універсітэце адкрылася новая кафедра – сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі.*



**На здымку: юбіляра віншуе загадчык кафедры педагогікі акадэмік НАНБ І.Ф.Харламаў.**

24 верасня ў зале пасяджэнняў ГДУ было шматлюдна і ўрачыста. Сюды прыйшлі кіраўнікі універсітэта, выкладчыкі, калегі юбіляра, яго былыя аспіранты, вучні, шматлікія госці – прадстаўнікі абласных і гарадскіх улад, ветэранскіх арганізацый.

Юбіляр са шматлікімі ўзнагародамі на грудзях, усхваляваны, расчулены да слёз, прымаў у свой адрас самыя цёплыя, шчырыя і кранальныя віншаванні. Вёў урачыстую цырымонію рэктар доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член Савета Рэспублікі М.В.Селькін. Ён нагадаў асноўныя вехі жыцця Міхаіла Афанасьевіча – простага вясковага настаўніка, партызана-падпольшчыка, педагога, вучонага і проста Чалавека з вялікай літары, падзякаваў за яго адданае служэнне абранай справе, людзям і пажадаў яму моцнага здароўя, актыўнага даўгалецця. Міхаіл Васільевіч уручыў яму прывітальны адрас, Ганаровую грамату універсітэта, букет кветак.

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую работу і дасягнутыя поспехі ў справе захавання і адраджэння нацыянальнай культуры Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў узнагароджаны рэктар нашага універсітэта прафесар **СЕЛЬКІН Міхаіл Васільевіч.**

* * *

За вялікі ўклад у падрыхтоўку кадраў адукацыі, актыўны ўдзел у навуковай і грамадскай рабоце і ў сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння доктар педагагічных навук, прафесар **ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Афанасьевіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

## З ГАНАРОВЫМ ЗВАННЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, спартклуб, калектыў кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту горача віншуюць дацэнта названай кафедры, кандыдата педагагічных навук **МІХАЛЕНЮ Валерыя Маркавіча** з прысваеннем яму ганаровага звання "Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь".*

ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

# ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

На падставе рашэння Савета універсітэта ад 30 жніўня 2001г. па выніках летняй залікова-экзаменацыйнай сесіі 2000-2001 навучальнага года назначаны стыпендыі:

**ІМЯ Я.КАРСКАГА**

**КУПО Алене** — студэнтцы 4 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова".

**ІМЯ П.БРОЎКІ**

**БРЫЛЕЎСКАЙ Вераніцы** — студэнтцы 5 курса юрыдычнага факультэта спецыяльнасці "Правазнаўства".

**ІМЯ Я.КОЛАСА**

**МАЛАШАНКА Наталлі** — студэнтцы 5 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Руская мова" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура".

**ІМЯ А.С.ПУШКІНА**

**ЯСЬКОВУ Дзмітрыю** — студэнту 4 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Руская мова і літаратура".

**ІМЯ Я.КУПАЛЫ**

**ФІЛІМОНАВАЙ Наталлі** — студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура".

**ІМЯ К.КРАПІВЫ**

**СІМАНЕНКУ Дзмітрыю** — студэнту 4 курса матэматычнага факультэта спецыяльнасці "Матэматыка".

**ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**ЛІН Святлане** — студэнтцы 4 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве".

**ЕЎТУХОВУ Андрэю** — студэнту 5 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці "Фізіка" (вытворчае аддзяленне).

**БАЙКОВУ Сяргею** — студэнту 4 курса факультэта фізвыхавання.

**ІМЯ М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАГА**

**АРЛОВАЙ Аліне** — студэнтцы 4 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве".

**АБРАМЕНКА Алене** — студэнтцы 4 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя".

(фінансуецца Рэчыцкім гарадскім выканаўчым камітэтам дадаткова да вучэбнай стыпендыі).

**ПЕРСАНАЛЬНАЯ СТЫПЕНДЫЯ САВЕТА ВНУ ІМЯ БОКУЦЯ Б.В.**

**СЕРАДЗЕ Андрэю** — студэнту 4 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці "Фізіка".

**ПЕРСАНАЛЬНАЯ СТЫПЕНДЫЯ САВЕТА ГДУ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**БАЕВІЧУ Георгію** — студэнту 5 курса фізічнага факультэта.

**МАЛЬЦАВУ Яўгену, ЦЫТРЫНАВУ Андрэю, ГРАЗНУХІНУ Дзмітрыю** — студэнтам 4 курса фізічнага факультэта.

**ПАЛЕГІНАЙ Наталлі, ЦЕЛЯХОВІЧ Таццяне** — студэнткам 4 курса філалагічнага факультэта.

**БАРЫСЕНКА Ірыне, СВЯРДЛОВАЙ Кацярыне, КАДУШКІНАЙ Ірыне** — студэнткам 5 курса філалагічнага факультэта.

**КАШЭВІЧ Алесі** — студэнтцы 5 курса гістарычнага факультэта.

**ПАЎЛАЎЦУ Аляксею** — студэнту 4 курса гістарычнага факультэта.

**КРАЎЦОВАЙ Наталлі, АНАНЬЕВАЙ Вользе, ЦІМАШЭНКУ Сяргею** — студэнтам 4 курса эканамічнага факультэта.

**БАННІКАВАЙ Зінаідзе** — студэнтцы 3 курса эканамічнага факультэта.

**СКАЧКОВАЙ Святлане, КІРАВАЙ Крысціне** — студэнткам 4 курса факультэта фізічнай культуры.

**ЦІТОВУ Алегу, РЫЖЫКУ Іллі** — студэнтам 4 курса матэматычнага факультэта.

**КУЗНЯЦОВУ Арцёму** — студэнту 5 курса матэматычнага факультэта.

**СУДЗІЛОЎСКАМУ Канстанціну** — студэнту 3 курса матэматычнага факультэта.

**ДЗЕЛІКАТНАЙ Алесі, НАСОН Наталлі, ІГНАЦЬЕВАЙ Ірыне** — студэнткам 4 курса факультэта замежных моў.

**ПАНКРАТАВУ Дзмітрыю, ШВАЙЛІКАВАЙ Святлане, ГРЫШЧАНКА Галіне** — студэнтам 5 курса факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

**ВАНСОВІЧ Але, ФЛЁРКА Таццяне, КАРЛІОНАВАЙ Наталлі** — студэнткам 4 курса геолага-геаграфічнага факультэта.

**КАРОПЕ Ягору, БОРДАК Дар'і** — студэнтам 3 курса юрыдычнага факультэта.

**РАМЕННІКАВАЙ Аляксандры** — студэнтцы 4 курса юрыдычнага факультэта.

**ЛУК'ЯНАВАЙ Анастасіі, КРЭЗ Марыне** — студэнткам 5 курса юрыдычнага факультэта.

**РАКАВАЙ Марыне** — студэнтцы 5 курса біялагічнага факультэта.

**БАЧУРА Юліі, ШАЎЦОВАЙ Людміле** — студэнткам 4 курса біялагічнага факультэта.

**БАРСУКОВАЙ Таццяне** — студэнтцы 3 курса біялагічнага факультэта.

**СТЫПЕНДЫІ ПРАФКАМА СТУДЭНТАЎ ГДУ:**

**БЫКОЎСКАМУ Валерыю** — студэнту 5 курса біялагічнага факультэта.

**ГАЙКОВАЙ Таццяне** — студэнтцы 4 курса фізічнага факультэта.

**МІСАЧЭНКУ Сяргею** — студэнту 5 курса юрыдычнага факультэта.

**КІСЕЛЬ Вользе** — студэнтцы 5 курса факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі.

Савет прыняў рашэнне аб накіраванні дэканатамі факультэтаў падзячных лістоў бацькам імянных стыпендыятаў і круглых выдатнікаў.

Выстаўкі

# СВЕТ ВАЧЫМА ЮНАЙ МАСТАЧКІ

Каці Калінінай, персанальная выстаўка работ якой разгорнута цяпер у выставачнай зале ГДУ, толькі 16 год. Але жывапіс юнай мастачкі, вучаніцы літаратурнага класа СШ №56, ужо можна назваць сур'ёзным і сталым. Гэта бачна з яе карцін – і пафіласофску заглыбленых, і шчыра даверлівых, на якіх радасць ад навакольнага свету з усімі яго праявамі.

Малюе дзяўчына з 4 гадоў, скончыла дзіцячую мастацкую школу, але вучыцца ў яе педагогаў і дагэтуль. Цікавы і такі факт: яе дзядуля М.А.Калінін, былы работнік нашага універсітэта, самадзейны мастак. Выстаўка яго работ таксама наладжвалася ў сценах гэтай залы.

Нашы юбіляры

# ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Словы прызнання, павагі за працоўныя, баявыя заслугі выказалі М.А.Дзмітрыеву намеснік старшыні гарвыканкама В.В.Зашчук, старшыні абласной і гарадской ветэранскіх арганізацый М.В.Ігнаценка і В.Ц.Булгакаў, намеснік начальніка абласнога упраўлення адукацыі Л.І.Кацегава, рэктар абласнога Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі Н.А.Котава, якія ўручылі Міхаілу Афанасьевічу Ганаровыя граматы, падарункі, букеты руж.

Гарачае прывітанне юбіляру прывезлі ад яго землякоў з Карманшчыны, дзе Міхаіл Афанасьевіч доўгі час настаўнічаў: быў дырэктарам СШ №2, а потым школы-інтэрната, яго былыя выхаванцы, а цяпер самі педагогі Т.І.Чакалава, У.К.Клімаў, дырэктар СШ №2 г.п.Кармы В.Р.Клюева, загадчыца раённага аддзела адукацыі Л.У.Ланюгова. Яны запэўнілі, што М.А.Дзмітрыева ў гэтым куточку Гомельшчыны ўспамінаюць з вялікай удзячнасцю, а яго былая праца тут служыць ім прыкладам у выхаванні падрастаючага пакалення. Вельмі цёплыя радкі віншаванняў, падарункі, кветкі сталі сведчаннем іх глыбокай павагі і прызнання юбіляру.

Плённы перыяд у працоўнай дзейнасці М.А.Дзмітрыева быў звязаны і з Мазырскім педінстытутам Н.К.Крупскай, рэктарам якога ён з'яўляўся. Павіншаваць яго са знамянальнай датай у жыцці прыехалі з гэтай навучальнай установы дацэнт І.А.Карабанаў і начальнік аддзела кадраў В.А.Шыманская. Да слоў шчырых віншаванняў і найлепшых пажаданняў яны далучылі падарункі, зробленыя рукамі студэнтаў – выразаныя з дрэва хлебніцу і пано з вінаграднай лазой, як сімвалы багацця і жыцця.

Працалюбству, прынцыповасці, высакароднасці вучыліся ў М.А.Дзмітрыева яго калегі па кафедры педагогікі ГДУ. Аб гэтым яны, у прыватнасці, напісалі ў прывітальным адрасе юбіляру, які ўручыў яго сябар загадчык названай кафедры акадэмік І.Ф.Харламаў.



Сапраўдным жыццёвым подзвігам назваў у сваім выступленні ганаровы рэктар і прафесар ГДУ Л.А.Шамяткоў паспяховую абарону Міхаілам Афанасьевічам доктарскай дысертацыі ў … 72 гады!

Як актыўнага змагара за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, ветэрана, які вядзе вялікую патрыятычную работу сярод моладзі, М.А.Дзмітрыева таксама цёпла віншавалі Герой Савецкага Саюза У.В.Гамзін, палкоўнік у адстаўцы С.Ф.Шакараў, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Т.І.Яззпава, першы сакратар Гомельскага АК КПБ, прарэктар Гомельскага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога С.І.Пракапенка, сакратары Гомельскага абкама і гаркама КПБ М.І.Хільман і Т.І.Лузан, якія ўручылі яму медаль "55 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне", Ганаровыя граматы, сувеніры і кветкі.

Вялікую павагу і ўдзячнасць выказалі юбіляру старшыня прафкама ГДУ Г.І.Варатніцкі, дацэнт кафедры матаналізу У.Р.Ермакоў.

У музеі-лабараторыі Францыска Скарыны ўдзельнікі ўрачыстай цырымоніі азнаёміліся таксама з дакументальнай і навукова-літаратурнай выстаўкай, прысвечанай 80-годдзю М.А. Дзмітрыева **(на здымку)**. Яе падрыхтавала дацэнт В.П.Горленка разам з калектывам кафедры педагогікі.

У вельмі цікавых і шматлікіх фотаздымках усіх перыядаў працоўнай і грамадскай дзейнасці М.А.Дзмітрыева, яго навуковых і метадычных работах па педагогіцы, гісторыі адукацыі, у асабістых дакументальных кнігах-мемуарах, літаратурных творах аб ім беларускіх пісьменнікаў В.Віткі, М.Гроднева, а таксама ў перапісцы Міхаіла Афанасьевіча з класікам сусветнай педагогікі В.А.Сухамлінскім, з якім ён неаднойчы сустракаўся, як на далоні паўстала жыццё выдатнага настаўніка, вучонага, чалавека.

Мудры Сенека ў свой час сказаў, што вартасць чалавека – не ў суме год, а ў велічы яго спраў. Жыццё М.А.Дзмітрыева – яскравае таму пацвярджэнне.

**Т.ДУБЯК.**

**Фота У.Чысціка.**

# МІХАІЛ АФАНАСЬЕВІЧ ДЗМІТРЫЕЎ:

## ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ

**1936**
Настаўнік лікбезу пры Нова-Бялёўскай пачатковай школе Кармянскага раёна.

**1937**
Навучэнец Рагачоўскага педвучылішча.

**1939**
Студэнт Рагачоўскага настаўніцкага інстытута.

**1940**
Настаўнік Ліцвінавіцкай сярэдняй школы Кармянскага раёна.

**14.08.1941 – 23.11.1943**
Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны – партызан, баец 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады. Мае ўзнагароды: медаль "Партызану Вялікай Айчыннай вайны II ступені" (1943), медаль "За адвагу" (1943), ордэн Славы III ступені (1946), ордэн Айчыннай вайны II ступені (1985) і інш.

**1943**
Інспектар школ Гомельскага аблана.

**1944**
Дырэктар Журавіцкай сярэдняй школы Рагачоўскага раёна.

**1947**
Слухач партыйнай школы пры ЦК КПБ.

**1949**
Загадчык Кармянскага райана.

**1952**
Дырэктар Кармянскай рускай сярэдняй школы № 2.

**1960**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 14 жніўня 1960 г. узнагароджаны ордэнам Леніна.

**1961**
Назначаны дырэктарам Кармянскай сярэдняй школы-інтэрната.

**1964**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 17 жніўня 1964 г. прысвоена ганаровае званне "Заслужаны настаўнік Беларускай ССР".

**1967**
Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Узнагароджаны медалём удзельніка УСГВ.

**1968**
У НДІ тэорыі і гісторыі педагогікі АПН СССР абаронена дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па тэме "Грамадска-карысная праца навучэнцаў агульнаадукацыйнай школы Беларусі".
У якасці дэлегата ад Гомельскай вобласці ўдзельнічаў у рабоце Усесаюзнага з'езду настаўнікаў.

**1971**
Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 20 ліпеня 1971 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля "Серп і молат".

**1974**
Назначаны рэктарам Мазырскага педагагічнага інстытута імя. Н.К.Крупскай.

**1975**
Выдавецтвам "Беларусь" выдадзена кніга "Ля ціхай Серабранкі".
М.Гроднеў выдаў кнігу аб рабоце дырэктара Кармянскай школы-інтэрната М.А.Дзмітрыева "Зоркаўкі".

**1978**
Удзельнік VI з'езду настаўнікаў Беларускай ССР і Усесаюзнага з'езду настаўнікаў.

**1981**
Выдадзена кніга "У імя жыцця".

**1983**
Абраны дацэнтам кафедры педагогікі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

**1993**
26 лютага на Вучоным савеце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага абаронена доктарская дысертацыя па тэме "Станаўленне і развіццё політэхнічнай адукацыі і працоўнага выхавання ў агульнаадукацыйнай школе Рэспублікі Беларусь у 1919 – 1991 г.г."

**1994**
Рашэннем Атэстацыйнай калегіі прысвоена вучонае званне прафесара па кафедры педагогікі і псіхалогіі.

**1995**
23 студзеня абраны правадзейным членам Міжнароднай Акадэміі акмеалагічных навук.
25 мая абраны правадзейным членам Міжнароднай Акадэміі тэхнічнай адукацыі.

**1996**
Абраны членам-карэспандэнтам Беларускай Акадэміі адукацыі.

# ЗА РАДКАМІ ЎСПАМІНАЎ – ВЫДАТНЫ ПЕДАГОГ

"Кормянскую школу-интернат посетила делегация учителей и учащихся Павлышской средней школы Кировоградской области (Украина). Мы глубоко проникнуты сердечным, радушным приемом, который оказал нам коллектив учителей и учеников. Горячо благодарим директора школы – Михаила Афанасьевича Дмитриева. У вас, дорогие белорусские друзья, мы увидели подлинное мастерство воспитания. Вы глубоко чувствуете духовный мир ребенка, ваши прекрасные дети изумили нас своей добротой, человечностью.

Мы многому научились у вас."

**В.А.СУХОМЛИНСКИЙ, директор Павлышской средней школы, член-корреспондент Академии педагогических наук РСФСР, заслуженный учитель школы УРСР.**

* * *

"Па глыбокім перакананні Дзмітрыева – толькі дабро нараджае дабро… Гэта ў дачыненні да асноў выхавання – дабро патрабавальнае, іншы раз і строгае, і няўмольнае. Дабро – сінонім якому ў дачыненні да кожнага без выключэння дзіцяці – добразычлівасць".

**Л.КАРМАЛІТАВА, "Даследчык", ("Настаўніцкая газета", 1971 год).**

* * *

"Дзмітрыеў верыў і верыць у самы галоўны сродак – у сэрца педагога. Дабрату можна выхаваць толькі дабратой, давер – даверам, душэўнасць – душэўнасцю…"

**Васіль ВІТКА, "Дзеці і мы" ("Полымя", 1975 год).**



***У папярэднім нумары нашай газеты паведамлялася аб удзеле і выступленні з дакладам на чарговай Гардонаўскай навуковай канферэнцыі доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара кафедры оптыкі ГДУ Г.С.Міцюрыча. Мы папрасілі Георгія Сямёнавіча падзяліцца некаторымі сваімі ўражаннямі, якія засталіся ў яго ад гэтай паездкі.***

# НАВУКА – НА СЛУЖБЕ ЗДАРОЎЯ

**У ГОНАР ВЫДАТНАГА ВУЧОНАГА**

Перш за ўсё хачу сказаць аб тым, чаму гэтыя навуковыя канферэнцыі называюцца Гардонаўскімі. Яны прысвячаюцца светлай памяці выдатнага вучонага-хіміка М.Гардона (1886-1949 г.г.). Ён унёс велізарны ўклад у сусветную навуку. На навуковых форумах у пэўнай ступені падводзяцца вынікі сучасных даследаванняў у галіне біялогіі, хіміі, фізікі і звязаных з імі тэхналогій. Толькі сёлета праведзена больш за 200 Гардонаўскіх канферэнцый у розных краінах свету па разнастайных навуковых напрамках. На іх запрашаліся вядучыя спецыялісты. Прыемна сказаць, што мне пашчасціла сустрэцца і мець зносіны з вядомымі прафесарамі ў галіне фотаакустыкі. Дарэчы, на жнівеньскай канферэнцыі я быў адзіным прадстаўніком ад Беларусі.

**ОКСФАРД – ПРЭСТЫЖНЫ ЦЭНТР АДУКАЦЫІ**

Гэты горад знаходзіцца прыкладна ў 80 км ад Лондана. Усяму свету ён вядомы сваім універсітэтам, дзе больш за 20 каледжаў.

Наша канферэнцыя праходзіла ў Каралеўскім каледжы, які быў заснаваны ў 1341 годзе. Цяпер можна толькі ўявіць, на якім узроўні там навука, якія адносіны да развіцця адукацыі. У прыватнасці, ва універсітэце ёсць багацейшая бібліятэка, заснаваная ў XIV ст. Колькі войнаў і папялішчаў перанесла краіна, а старажытны харом кнігі захаваўся, народ яго пільна аберагае.

Нават добра асвядомленаму чалавеку ў Оксфардзе можна многаму здзіўляцца на кожным кроку. Напрыклад, я зайшоў у кнігарню (двухпавярховы будынак), і каб знайсці раздзел "Фізіка", спатрэбілася звярнуцца ў інфармацыйны цэнтр. Быў захоплены вялікай колькасцю кніг, выдадзеных у 2001 годзе. У прыватнасці, перавыдадзена больш 10 навуковых прац Эйнштэйна. Асобныя шырокавядомыя навуковыя працы, перавыдадзеныя ў гэтым годзе ў Англіі, на постсавецкай прасторы не перавыдаваліся па 20-30 гадоў.

**КОЖНЫ ДАКЛАД СТАЎ ПАДЗЕЯЙ**

Іменна так можна сказаць пра галоўную адметнасць прайшоўшай канферэнцыі. У выніку абмеркавання майго даклада ўзнікла ідэя стварыць сумесны руска-беларуска-амерыканскі праект у галіне імпульснай лазернай фотаакустычнай спектраскапіі з мэтай дыягностыкі ранняй стадыі ракавых пухлін. Сумесна з доктарам фізіка-матэматычных навук з МДУ імя М.В.Ламаносава А.А.Карабутавым пабудавана мадэль аднаўлення аптычнай неаднароднасці асяроддзя па эксперыментальна змеранаму фотаакустычнаму сігналу. А.А.Карабутаў тры гады працаваў у медыцынскім цэнтры Тэхаскага універсітэта ЗША. Пры яго ўдзеле там створана оптыка-акустычная лазерная сістэма неіўназіўнай (неразбураючай) біапсіі.

Асноўныя выканаўцы нашага сумеснага праекта – Міжнародны лазерны цэнтр МДУ, кафедра оптыкі і навукова-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства "Лазерныя тэхналогіі" ГДУ імя Ф.Скарыны, намеснікам дырэктара якога я з'яўляюся, медыцынскі цэнтр Тэхаскага універсітэта. Прадугледжваецца стварыць эксперыментальную ўстаноўку для дыягностыкі ранніх стадый злаякасных пухлін малочнай і шчытападобнай залоз.

Можа ўзнікнуць пытанне: у чым будзе перавага новага метада дыягностыкі ў параўнанні з ужо існуючым?

Аптычная тамаграфія, напрыклад, з-за моцнага рассейвання святла не дазваляе даследаваць тканкі на вялікіх глыбінях. Ультрагукавая – не дае кантраснасці. Наша ствараемая ўстаноўка лазернай оптаакустычнай дыягностыкі дазваляе даследаваць тканкі на глыбіні 5-6 см пры высокай кантраснасці і дакладнасці адлюстравання. Уявіце: імпульс святла пападае на асяроддзе, пераўтвараецца праз цяпло ў гукавую хвалю і датчыкі здымаюць сігнал. Прычым мы адыходзім ад тых негатыўных момантаў, якія маюць аптычная і ўльтрагукавая тамаграфія. Такая методыка з'яўляецца ўнікальнай у свеце, нідзе яшчэ не распрацавана. Мы хацелі б стварыць такія ўстаноўкі ў першую чаргу для аналізу стану здароўя жыхароў Гомельшчыны, а таксама суседніх з ёй абласцей Расіі і Украіны, якія найбольш пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС. Плануем пры наяўнасці фінансавання стварыць першую эксперыментальную ўстаноўку за адзін год.

**УДЗЯЧНЫ ЗА СПОНСАРСКУЮ ДАПАМОГУ**

Цяпер, на жаль, на многае не хапае фінансавых сродкаў, у тым ліку і на навуку. Без істотнай дапамогі спонсараў не адбылася б і мая паездка ў Велікабрытанію на Гардонаўскую навуковую канферэнцыю. Таму я шчыра ўдзячны за аказаную мне дапамогу кіраўніцтву кампаніі "Слаўнафта", АТ "Мазырскі НПЗ", а таксама старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкаму і рэктару нашага універсітэта прафесару М.В.Селькіну за падтрымку і разуменне важнасці праблемы, якую нам належыць вырашыць.

**Г.МІЦЮРЫЧ,**
**доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі.**

**Фота У.Чысціка.**

# ВЫНІКІ ПАДВЯЛА ДЗЯРЖКАМІСІЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

цынскіх даведак, выпісак з працоўнай кніжкі, не вызначаны тэрміны падачы арыгіналаў да дакументаў аб адукацыі. Міністэрствам адукацыі было дапушчана таксама супадзенне тэрмінаў правядзення экзаменаў у ВНУ, якія маюць права вызначаць іх самастойна, з раскладам экзаменаў у іншых ВНУ.

Шмат увагі членамі дзяржкамісіі было ўдзелена разгляду зваротаў грамадзян, якіх паступіла звыш 11 тысяч, а таксама выкананню вызначанага парадку залічэння абітурыентаў. У перыяд уступнай кампаніі ў ВНУ паступіла 447 апеляцый (у 2000 годзе – 475), з іх задаволена 138, ці 31% (у 2000 годзе – 130, ці 27%).

У ходзе работы дзяржаўнай камісіяй быў выяўлены шэраг парушэнняў з боку прыёмных і экзаменацыйных камісій ВНУ. У асобных навучальных установах не выконваўся прынцып ратацыі членаў прыёмных і экзаменацыйных камісій, фіксаваліся факты парушэння парадку захоўвання экзаменацыйных матэрыялаў, адзначаліся парушэнні па афармленню экзаменацыйных ведамасцяў.

Дзяржаўнай камісіяй былі выяўлены таксама факты парушэнняў і з боку абітурыентаў, былі адхіленні ад здачы ўступных экзаменаў.

У дзяржаўныя ВНУ рэспублікі па ўсіх формах навучання прынята 58 тысяч студэнтаў, што на 1087 больш, чым у 2000 годзе. У прыватныя ВНУ (прыём у іх праводзіцца да 15.10.2001) прынята 11,4 тыс. студэнтаў, што на 700 больш, чым усяго было прынята ў мінулым годзе.

У той жа час экзаменацыйная кампанія выявіла шэраг значных праблем. Перш за ўсё – гэта недастатковы ўзровень ведаў абітурыентаў па асобных прадметах. Калі ў цэлым пры паступленні ў ВНУ рэспублікі 14,3% абітурыентаў не справіліся з экзаменацыйнымі заданнямі, то па хіміі (пісьмова) атрымалі адзнаку "2" – 25,9%, па матэматыцы (пісьмова) – 24,4%. У асобных навучальных установах гэты працэнт быў яшчэ вышэйшым.

Праведзены аналіз залічэння абітурыентаў, якія паступалі ў 2001 годзе па мэтавых накіраваннях, паказаў, што заказчыкі не забяспечваюць конкурсны адбор на мэтавыя месцы і парушаюць прыняты парадак заключэння дагавораў. Выкарыстоўваецца практыка выдачы аднаго накіравання на адно месца, тым самым штучна зніжаецца конкурс сярод гэтага кантынгенту абітурыентаў. У выніку сярэдні конкурс па мэтаваму набору склаў 1,6 чалавека на месца. Узнікае сітуацыя, калі залічваюцца абітурыенты-мэтавікі, набраўшыя невысокі бал, а абітурыенты, якія маюць больш высокі бал, але не прайшлі па агульнаму конкурсу, застаюцца незапатрабаванымі для ВНУ.

Не менш увагі заслугоўвае і сітуацыя з медалістамі. У гэтым годзе ў ВНУ рэспублікі пададзена 15,5 тысячы заяў абітурыентамі, хто закончылі школу з залатым і сярэбраным медалямі, з якіх залічаны 6491 чалавек. У 1784 выпадках медалістамі атрымана нездавальняючая адзнака (11,5% ад колькасці пададзеных заяў). Так, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка з 759 медалістаў, якія здавалі экзамены, 255 (33,6%) атрымалі нездавальняючую адзнаку, у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова з 229 – 45 (19,7%).

У рэспубліцы пакуль яшчэ адсутнічае адзіная нарматыўная база правядзення ўступных іспытаў (экзаменаў, гутарак, тэсціравання) для дзяржаўных і прыватных навучальных устаноў. Больш таго, у кожнай прыватнай навучальнай установе распрацаваны свае крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў.

Патрабуе ўдасканалення практыка набору студэнтаў у дзяржаўныя ВНУ і ВНУ на платную форму навучання. Пры залічэнні на дадзеную форму навучання, ігнаруючы прынцып конкурснасці, часта прымаюцца асобы, узровень ведаў якіх і здольнасць да навучання недастатковыя. Падобная практыка садзейнічае таму, што ў далейшым студэнцкія групы камплектуюцца са студэнтаў з розным узроўнем падрыхтоўкі, што не дазваляе належным чынам арганізаваць навучальны працэс. Такое становішча не дапушчальнае ў першую чаргу пры наборы на спецыяльнасці, па якіх праграма навучання дапускае набор студэнтаў з высокім узроўнем ведаў.

**(Па звестках прэс-цэнтра Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь).**

# САБАЛЕНКА УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ



28 верасня на 67-м годзе жыцця раптоўна памёр кандыдат філалагічных навук, дацэнт Сабаленка Уладзімір Мікалаевіч.

У.М.Сабаленка нарадзіўся ў ліпені 1935 года ў г.Гомелі. У 1958г. закончыў Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава. Служыў у радах Савецкай Арміі, пасля чаго працаваў завучам гомельскай СШ № 23. У 1961-1964 г.г. знаходзіўся на партыйнай рабоце. Затым вучыўся ў аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, дзе ў 1967 г. паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Усё астатняе працоўнае жыццё У.М.Сабаленкі было звязана з нашым універсітэтам. Тут ён прайшоў шлях ад старшага выкладчыка, дацэнта да загадчыка кафедры рускай літаратуры, якую ўзначальваў больш за 16 гадоў. Пэўны час Уладзімір Мікалаевіч працаваў намеснікам дэкана гісторыка-філалагічнага факультэта. У 1978 г. ён закончыў дактарантуру, аўтар манаграфіі "Жанр рамана-эпапеі". З 1979 г. па 1981 г. выкладаў у адным з універсітэтаў Судана.

У.М.Сабаленка вызначаўся высокай эрудыцыяй, глыбокім веданнем выкладаемых дысцыплін. Ён прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта і нашага горада. Уладзімір Мікалаевіч карыстаўся заслужанай павагай і аўтарытэтам сярод калег, студэнцкай моладзі і кожнага, хто меў з ім зносіны, каму ён шчодра перадаваў свае багатыя веды і жыццёвы вопыт.

Светлая памяць аб Уладзіміру Мікалаевічу Сабаленку назаўжды захаваецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

# У ПРАФКАМЕ

***На пасяджэнні прафсаюзнага камітэта, якое адбылося ў верасні, разгледжаны пытанні аб гатоўнасці аўдыторнага фонду да навучальнага года, правілах пастаноўкі на чаргу на атрыманне жылля, дзейнасці садова-агароднага таварыства, аздараўленні членаў універсітэцкага калектыву і іх дзяцей. З інфармацыяй выступілі адпаведна начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова, старшыня жыллёва-бытавой камісіі М.М.Фядосенка, дацэнт кафедры "Фінансы і крэдыт" М.У.Акуліч, бухгалтар прафкама Т.А.Валчкова.***

**ЯК ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА АЎДЫТОРНЫ ФОНД**

Вучэбны працэс ва універсітэце ідзе ў даволі напружаным рытме. Студэнты 11 факультэтаў займаюцца ў дзве змены, і наяўны аўдыторны фонд, лабараторыі ва ўсіх пяці вучэбных карпусах выкарыстоўваюцца з поўнай загрузкай. На сённяшні дзень у ГДУ налічваецца 5513 студэнтаў, якія падзелены на 207 акадэмічных груп, у тым ліку 4 групы замежных навучэнцаў. Для іх заняткаў у наяўнасці – 93 аўдыторыі, з іх 31 – лекцыйная.

Да пачатку новага навучальнага года ў асноўным сіламі саміх студэнтаў у вучэбных карпусах быў зроблены касметычны рамонт. Цэнячы сваю працу, моладзь больш ашчадна, беражліва стала адносіцца да універсітэцкай маёмасці.

Улічваючы тое, што ва універсітэт прынята на вучобу дадатковая колькасць студэнтаў на платнай аснове, у першыя дні заняткаў узнікла праблема недахопу мэблі ў вучэбных аўдыторыях. Зараз становішча нармалізавалася: закуплены недастаючыя камплекты мэблі і размеркаваны па карпусах. Яна будзе закупляцца і ў далейшым для поўнага задавальнення патрэб у ёй.

**У ЧАРГУ – ЗА ЖЫЛЛЁМ**

Згодна пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.09.1999 г. жыллёва-бытавая камісія прафкама правяла вялікую работу па ўпарадкаванню ўліку работнікаў ГДУ, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па стану на верасень у спісах па ўліку сацыяльнага жылля ва універсітэце значацца 28 чалавек. Гэта тыя, хто своечасова абнавіў усе неабходныя даведкі, дакументы і здаў іх у жыллёва-бытавую камісію прафкама.

Сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ ёсць такія, хто мае права быць пастаўленым на ўлік, каб атрымаць жыллё ў інтэрнаце па вул.Савецкай, 106. Да іх адносяцца тыя, хто здымае кватэру, жыве ў прыгарадзе, не мае гомельскай прапіскі, маладыя сем'і.

**НЕ ЎСЕ ДБАЙНЫЯ ГАСПАДАРЫ**

У садова-агародным таварыстве, якое размяшчаецца каля п.Калініна Гомельскага раёна, па словах яго старшыні М.У.Акуліча, справы ў асноўным ідуць нармальна. Няма запазычанасці за аплату электраэнергіі, зямельнага падатку, стараннасць у працы многіх дачнікаў кампенсуецца добрымі ўраджаямі. Выключэнне, праўда, складаюць некалькі чалавек, якія ствараюць праблемы з-за неапрацоўваемага на працягу доўгага часу зямельнага надзелу, і пустазелле на ім шчодра "дзеліцца" сваім насеннем з суседнімі ўчасткамі. Гэтым нядбайным гаспадарам указана на недапушчальнасць такога становішча ў далейшым.

**АДПАЧЫЛІ ПА ПУЦЁЎКАХ**

Лета, якога з нецярплівасцю чакалі і дарослыя, і дзеці, праляцела як адно імгненне. Кожны з нас звязваў з ім свае надзеі на добры адпачынак, умацаванне здароўя, чаму ў многім садзейнічала атрыманая пуцёўка ў пансіянат ці санаторый.

Што сёлетнім летам змагла прапанаваць выкладчыкам, супрацоўнікам ГДУ і іх дзецям камісія па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню нашага універсітэта? Пуцёўкі па сацыяльнаму страхаванню атрымалі 28 чалавек, якія ў час свайго летняга адпачынку змаглі паправіць здароўе ў санаторыях Беларусі. Ліквідатарамі аварыі на ЧАЭС, маці з дзецьмі ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў былі выкарыстаны 43 пуцёўкі. У дзіцячых санаторыях лячыліся і адпачывалі 10 школьнікаў, у піянерскіх лагерах на Віцебшчыне і ў нашай вобласці – 42 дзіцяці выкладчыкаў і супрацоўнікаў, у доме адпачынку "Пунцовыя ветразі" цікава правялі час 11 падлеткаў. Усяго ж са студзеня і па верасень г.г. у калектыве універсітэта выкарыстаны 193 пуцёўкі.

## Студэнцкая практыка

*Быў час, калі ў маляўнічым урочышчы Чонкі будучыя біёлагі і геолагі з карысцю і весела праводзілі летнія дзянькі. Аграбіястанцыя ўсебакова забяспечвала адну з важных складаючых вучэбнага працэсу – студэнцкую практыку. Стацыянарныя жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы, сама мясцовасць – з прыгожым сасновым лесам, шырокімі дубравамі, ракой Сож з багатай прыбярэжнаводнай расліннасцю давалі студэнтам выдатную магчымасць не толькі выконваць усе заданні практыкі, але і цудоўна адпачыць у гэтым маляўнічым, запаведным куточку Гомельшчыны.*

*Па тых ці іншых прычынах на працягу некалькіх гадоў станцыя не эксплуатавалася ў поўным аб'ёме. Студэнты разам з выкладчыкамі, каб выканаць праграму летняй практыкі, вымушаны былі праводзіць экскурсіі пешшу або на аўтобусах у ваколіцах абласнога цэнтра, а потым вяртацца назад, у горад.*

*І вось ужо другое лета студэнты біялагічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў зноў правялі практыку ў Чонках. Спачатку зведалі рамантыку жыцця ў палатках, а сёлетняй вясной будаўнічая брыгада, да якой далучыліся студэнты, што здалі экзаменацыйную сесію, абудзілі лясную цішыню сякерамі і піламі. І выраслі, нібы грыбы пасля дажджу, ззяючыя на сонцы сваім яркім жоўтым колерам 15 драўляна-фанерных домікаў-"вігвамаў". Быў зроблены касметычны рамонт старых памяшканняў, студэнты-біёлагі разам з дэканам факультэта, загадчыкам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, выкладчыкамі, куратарамі прыбралі тэрыторыю, разбілі клумбы, пасадзілі кветкі і дэкаратыўныя кусты. Пасля гэтага старая станцыя быццам памаладзела, адчула другое дыханне.*

# АДРАДЖЭННЕ СТАНЦЫІ

...Чэрвень сёлета выдаўся надзвычай пахмурным і даждлівым. Не зусім пашанцавала з надвор'ем тым студэнтам, практыка ў якіх праходзіла менавіта ў гэты час. І ў той дзень, калі мы прыехалі ў Чонкі разам са старшынёй прафкама студэнтаў Н.І.Колтышавай, галоўным урачом санаторыя-прафілакторыя А.М.Сабалеўскім, дырэктарам прадпрыемства грамадскага харчавання Т.М.Соціевай, якія выраšалі тут свае арганізацыйныя надзённыя пытанні, – харчавання, аховы здароўя студэнтаў, з самай раніцы таксама ішоў дождж. У такое надвор'е студэнты займаліся справамі на базе. М.Р.Вяруцін, ст. выкладчык кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі, які разам з асістэнтам С.У.Каваленкам і лабарантам І.А.Красоўскай кіравалі практыкай будучых геолагаў, расказаў аб тым, што робяць студэнты: вызначаюць фільтрацыйныя параметры ваданосных гарызонтаў, глыбіню залягання ўзроўню грунтоўных вод, вядуць радыеметрычныя здымкі, вывучаюць прыродныя электрычныя палі над інжынернымі збудаваннямі і інш. Атрыманыя вынікі апрацоўваюць потым, сістэматызуюць і пішуць справаздачы, каб абараніць іх у канцы практыкі.

З другакурсніцамі-біёлагамі, якія размясціліся ў стацыянарным двухпавярховым цагляным будынку, таксама разгаварыліся аб тым, як выконваюць яны практычныя заданні. Іх "вынікі" былі відаць паўсюдна: у жылых пакоях на падаконніках, на падлозе, нават на ложках сушыліся сабраныя імі расліны для гербарыя. Спецыяльнага месца, дзе іх можна было б захоўваць, на базе пакуль няма.

Надакучлівы дождж не даваў магчымасці больш дэталёва пазнаёміцца з жыццядзейнасцю базы, таму я вырашыла прыехаць У Чонкі яшчэ раз.

Першае, чаго захацелася пасля прыезду сюды ў 30-градусную ліпеньскую спёку, – напіцца халоднай вады. Калодзеж, які стаіць на тэрыторыі лагера, абяцаў такую жаданую вільгаць. Зачарпнула вядро, але выгляд і пах вады смагу адразу адагналі. Як потым высветлілася, піць ваду з гэтага калодзежа непажадана. У сёлетнюю летнюю гарачыню, калі слупок тэрмометра падымаўся вышэй за 35°, пытанне з пітной вадой на базе было даволі актуальным.

Быў апоўдзень. Групы студэнтаў-першакурснікаў разам з дацэнтам В.Я.Верамейчыкам, асістэнтам С.У.Аўсеенкам з кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, асістэнтам кафедры заалогіі і аховы прыроды А.У.Гулаковым вярнуліся на базу з экскурсій па ваколіцах Чонак і вялі апрацоўку сабранага ў лесе, на лузе ў вучэбных класах, якія, праўда, так назваць можна толькі ўмоўна, бо яшчэ адчувалася запусценне, да якога давёў гэтыя ў мінулым драўляныя пабудовы няўмольны час: тут яшчэ трэба папрацаваць будаўнікам, каб давесці гэтыя памяшканні да больш прывабнага стану. Да таго ж малавата ў іх месца для заняткаў, калі ўлічыць павелічэнне колькасці студэнтаў у акадэмічных групах.

Усё, што сістэматызавалася, апрацоўвалася тут, у класах, студэнты вымушаны былі несці потым у свае жылыя пакоі, бо спецыяльнага лабараторнага памяшкання на базе няма. Таму ідавялося ўбачыць у адным з цагляных домікаў, які тут жартоўна назвалі "церамок", такі малюнак: літаральна побач з асабістымі студэнцкімі рэчамі знаходзіліся слоікі з ... жыўнасцю – дробнымі насельнікамі балотаў, вадаёмаў, злоўленымі будучымі заолагамі. Па словах загадчыка вучэбна-навуковай базы ст. выкладчыка кафедры фізічнай культуры і спорту Ю.В.Маліноўскага, можна было б абсталяваць пад лабараторыю капітальны цагляны будынак, які пакуль стаіць пад замком. І ў працяг размовы Юрый Васільевіч расказаў аб тым, як рыхтавалася база для прыёму студэнтаў на практыку, які вялікі аб'ём работ быў выкананы за кароткі тэрмін, і што шмат яшчэ плануецца зрабіць у будучым агульнымі намаганнямі кіраўніцтва універсітэта, АГЧ. Перспектывы былі акрэслены шырокія: база павінна стаць не толькі месцам для практык, але і для фізкультурна-аздараўленчай работы сярод членаў калектыву універсітэта, прычым не толькі летам, але нават і зімой, каб можна было прыехаць сюды адпачыць у выхадныя дні. Для гэтага патрэбны час і немалыя матэрыяльныя сродкі. Задумы добрыя, і няхай яны здзейсняцца хутчэй.

А тым жа заўвагам і пажаданням, выказаным і студэнтамі, і выкладчыкамі з мэтай паляпшэння бытавых, санітарна-гігіенічных умоў іх знаходжання ў Чонках, трэба ў час падрыхтоўкі да будучага лета надаць першачарговую ўвагу.

Забяспечыць нармальнае харчаванне, сачыць за станам здароўя студэнтаў для адпаведных службаў універсітэта ў час практыкі таксама было сур'ёзным экзаменам. Кухонныя памяшканні сталовай, у якой харчаваліся насельнікі базы, пакуль што не ўкамплектаваны ўсім неабходным. Не хапае, у прыватнасці, халадзільнага абсталявання, і мяса-малочныя прадукты, фрукты, а таксама хлеба-булачныя вырабы прывозіліся сюды штодзённа спецыяльным рэйсам са сталовай ГДУ. Дырэктар прадпрыемства грамадскага харчавання Т.М.Соціева кантралявала гэты працэс асабіста, старалася як мага больш разнастаіць у межах выдзеленых грашовых сум трохразовае гарачае харчаванне сокамі, фруктамі, свежай выпечкай. Добрасумленна неслі тут "вахту" ў прамым сэнсе слова (змяняліся праз два дні) павары універсітэцкай сталовай і сталовай санаторыя-прафілакторыя Н.Атрошкіна, А.Курдзесава, Н.Кузняцова, прыбіральшчыцы Т.Анохіна, З.Струк пад умелым кіраўніцтвам повара-брыгадзіра М.Заплешнікавай і тэхнолага Н. Ефіменка. Студэнтам жа іншы раз хацелася ў дадатак яшчэ і чаго небудзь смачненькага, што можна было купіць у вясковым магазіне. Але знаходзіцца ён далекавата ад базы і туды часта не наведаешся. Таму ў размове і выказалі яны пажаданне на будучае: наладзіць тут праз буфет продаж фасаваных тавараў – мінеральнай вады, сокаў, пячэння, чыпсаў і г.д.

Усе медыцынскія паслугі маглі ў любы час аказаць пры неабходнасці ў медпункце на базе ўрачы Л.Ф.Пінчук, Р.М.Сількова, медсёстры Т.Р.Струкава, Т.В.Маісеенка, Г.А.Уласенка, Р.Ф.Ранішэнка з санаторыя-прафілакторыя. І сам яго галоўны ўрач А.М.Сабалеўскі неаднойчы наведваўся сюды, каб упэўніцца, што справы ідуць нармальна.

Шмат клопатаў і абавязкаў было і ў начальніка лагера намесніка дэкана біяфака па спартыўна-масавай рабоце, ст.выкладчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту У.П.Астахава. Ён аператыўна і станоўча вырашаў арганізацыйныя пытанні, звязаныя з забеспячэннем студэнцкай практыкі ўсім неабходным. Належны парадак падтрымліваў на базе і пастаянны пост міліцыі з арганізаваным кругласутачным дзяжурствам.

Разнастаіць жыццё студэнцкай моладзі, зрабіць яго цікавым, напоўненым у вольны час, стараліся таксама выкладчыцы факультэта фізічнай культуры Т.Ф.Геркусава і Т.Е.Магілёўцава: тут праводзіліся як асабовыя, так і камандныя захапляльныя спаборніцтвы па валейболу, футболу, бадмінтону, настольным тэнісе, шахматах і шашках. Ды і самі студэнты, як кажуць, не былі безыніцыятыўнымі. У адзін з выхадных дзён яны наладзілі традыцыйны "Дзень Нептуна" – свята вясёласці і розыгрышаў. Пераможцаў, актыўных удзельнікаў розных спаборніцтваў не забыўся павіншаваць прафкам студэнтаў у асобе яго старшыні Н.І.Колтышавай, якая прыязджала ў Чонкі, каб уручыць ім сувеніры і падарункі.

...Асфальтаванай дарогай, з аднаго боку якой – прыгожы лясны масіў, з другога – люстраная роўнаць Сожа, вярталася назад, у Гомель. У некаторых месцах шаша пятляе, і шафёр "скідваў" хуткасць. Тут і ўспомнілася закранутая ў лагеры выкладчыкамі яшчэ адна балючая тэма: аб неабходнасці зрабіць бліжэй да базы пешаходную разметку, паставіць знакі абмежавання хуткасці аўтатранспарту, улічваючы знаходжанне ў гэтай запаведнай зоне студэнтаў-практыкантаў. Зрабіць гэта трэба з мэтай перасцярогі ад няшчасных выпадкаў, бо сёлетнім летам адна з машын на вялікай хуткасці ледзь не збіла на павароце групу дзяўчат...

**Т.ДУБЯК.**

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАГА КОНКУРСУ "АНУ, ПЕРШАКУРСНІК!"

Штогод ва універсітэце праводзяцца конкурсы мастацкай самадзейнасці з мэтай развіцця творчай ініцыятывы, культурнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў. Адным з этапаў гэтага конкурсу сярод студэнтаў 1-га курса з'яўляецца "Ану, першакурснік!".

Сёлета агульнауніверсітэцкі конкурс будзе праходзіць на працягу 2 дзён. Яны вызначаны на мастацкім савеце:



**27 кастрычніка:**

***філалагічны факультэт***
***фізічны факультэт***
***матэматычны факультэт***
***факультэт замежных моў***
***факультэт фізічнай культуры***
***эканамічны факультэт;***

**28 кастрычніка**

***факультэт псіхалогіі***
***юрыдычны факультэт***
***геолага-геаграфічны факультэт***
***гістарычны факультэт***
***біялагічны факультэт.***

У конкурсе прымаюць удзел студэнты ТОЛЬКІ 1-га курса. Дапускаецца акампанемент з боку, а таксама ўдзел не першакурснікаў у парных выступленнях для цэльнасці і мастацкага ўзроўню нумара.

Працягласць выступлення кожнага калектыву – не больш 35 мінут (5 мінут кантрольных).

Конкурсныя праграмы павінны быць здадзены 23, 24, 25 кастрычніка на сцэне актавай залы. 25 кастрычніка неабходна прадставіць аддрукаваныя праграмы ў колькасці 10 экземпляраў.

У гэтым годзе калектывы рыхтуюць свае праграмы на абавязковай тэме "***У жыцці кожнага казка свая***". Непасрэдна выбар жанру, у якім рыхтуюцца праграмы, самастойны. Праграма павінна быць цікавай і змястоўнай. Журы ацэньвае раскрыццё тэмы, цэльнасць і рознажанравасць праграмы, а таксама акцёрскае і вакальнае майстэрства. Уся праграма ацэньваецца па 10-бальнай сістэме.

Вынікі конкурсу будуць падведзены пасля заканчэння другога конкурснага дня. Узнагароджванне з уручэннем пераходнага прыза таксама адбудзецца ў гэты дзень.

Праграмы ацэньвае альтэрнатыўнае журы ў складзе 7 чалавек. Гэта прадстаўнікі рэктарата, студэнцкага клуба ГДУ і запрошаныя спецыялісты па розных жанрах.

Палажэнне аб конкурсе прынята на мастацкім савеце студэнцкага клуба ГДУ імя Ф.Скарыны 10 верасня 2001 года.

**Аргкамітэт запрашае ўсіх на традыцыйны конкурс "Ану, першакурснік-2001!". Білеты можна набыць на факультэтах у культоргаў. Даведкі па тэл. 57-33-30.**

**Студэнцкі клуб МК ГДУ імя Ф.Скарыны.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
– беларускай мовы – асістэнта, дацэнта;
– эканамічнай інфарматыкі і АСК – старшага выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў філалагічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку раптоўнай смерці кандыдата філалагічных навук, дацэнта **САБАЛЕНКІ Уладзіміра Мікалаевіча** і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў вучэбнага аддзела выказваюць глыбокае спачуванне метадысту вучэбнага аддзела **СТАРАКОЖАВАЙ Валянціне Іванаўне** з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора – трагічнай смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат і калектыў факультэта замежных моў выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры англійскай мовы **АКУЛАВУ Іосіфу Маісеевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, калектыў кафедры "Фінансы і крэдыт" выказваюць глыбокае спачуванне асістэнту названай кафедры **ШАЛАМІЦКАЙ Таццяне Міхайлаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.
Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 577
Падпісана да друку 5.10.2001 г.